В. П. Красней

# Беларуская мова ў табліцах і схемах

Для школьнікаў

*8-е выданне*

Мінск • «Аверсэв» • 2020

# ФАНЕТЫКА

**Фанетыка** — раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца гукі мовы (іх уласцівасці, функцыі, класіфікацыя), а таксама склады слова, націск, інтанацыя.

## Гукі мовы

**Гук** — найменшая (непадзельная) адзінка мовы, утвораная органамі маўлення. Гукі мовы мы вымаўляем і чуем.

Па наяўнасці ці адсутнасці перашкоды ў ротавай поласці пры маўленні гукі мовы падзяляюцца на 2 групы:

- галосныя (перашкода адсутнічае, чуецца голас);
- зычныя (перашкода ўзнікае, чуецца шум і голас ці толькі шум).

## Галосныя гукі

Галосныя гукі характарызуюцца паводле месца ўтварэння, спосабу ўтварэння і ўдзелу губ.

| | | |
|---|---|---|
| 1. Месца ўтварэння (у залежнасці ад руху языка па гарызанталі) | **галосныя** | пярэдняга рада: [і], [э]<br>сярэдняга рада: [а], [ы]<br>задняга рада: [о], [у] |
| 2. Спосаб утварэння (у залежнасці ад пад'ёму спінкі языка да цвёрдага нёба) | **галосныя** | верхняга пад'ёму: [і], [ы], [у]<br>сярэдняга пад'ёму: [э], [о]<br>ніжняга пад'ёму: [а] |
| 3. Удзел губ (губы выцягнуты крыху ўперад і акруглены ці не ўдзельнічаюць) | **галосныя** | губныя [о], [у] (лабіялізаваныя)<br>негубныя [і], [ы], [э], [а] (нелабіялізаваныя) |

- Галосныя гукі ўтвараюць склады (а-та-ка), адрозніваюць словы (к[у]ток — к[а]ток, с[о]к — с[у]к).
- Галосныя гукі бываюць:
  – націскныя і ненаціскныя (саро́ка, касмана́ўт);
  – у моцнай пазіцыі (пад націскам) і ў слабай пазіцыі (не пад націскам): са́д — садо́к, до́м — дамо́к



© ТДА «Аверсэв»

# Зычныя гукі

Зычныя гукі паводле наяўнасці голасу і шуму ці толькі шуму пры іх утварэнні падзяляюцца на 2 групы:

| **санорныя — 11** (пры ўтварэнні голас значна перавышае шум) | **шумныя — 28** (пры ўтварэнні шум перавышае голас ці ўтвараюцца толькі з шуму) |
|---|---|
| [в], [в’]<br>[л], [л’]<br>[м], [м’]<br>[н], [н’]<br>[р]<br>[й’]<br>[ў]<br><br>Санорныя гукі:<br>• не маюць парных глухіх;<br>• не аглушаюцца перад глухімі і на канцы слова: імшара — і[м]шара, сум — су[м];<br>• не азванчаюць глухія: смак — [с]мак | **звонкія — 13** (з шуму і голасу) → ← **глухія — 15** (толькі з шуму)<br>утвараюць пары па звонкасці — глухасці:<br>[б] — [п], [б’] — [п’], [г] — [х], [г’] — [х’], [ґ] — [к], [ґ’] — [к’], [д] — [т], [ж] — [ш], [з] — [с], [з’] — [с’], [дж] — [ч], [дз] — [ц], [дз’] — [ц’].<br>Глухія [ф], [ф’] не маюць парных звонкіх.<br>• Пры ўтварэнні гукаў [з], [з’], [с], [с’], [дз], [дз’], [ц], [ц’] чуецца свісцячы шум, таму гэтыя гукі называюцца свісцячымі.<br>• Пры ўтварэнні гукаў [ж], [ш], [дж], [ч] шум нагадвае шыпенне, таму іх называюць шыпячымі.<br>• Гукі [б], [б’], [п], [п’], [м], [м’], [в], [в’], [ф], [ф’], [ў] вымаўляюцца з удзелам губ і называюцца губнымі.<br>• Гукі [г], [г’], [к], [к’], [х], [х’] вымаўляюцца пры актыўным удзеле задняй часткі языка, таму называюцца заднеязычнымі.<br>• Звонкія і глухія зычныя здольны адрозніваць словы: [д]ом — [т]ом, [ж]ыць — [ш]ыць.<br>• Моцныя пазіцыі для звонкіх і глухіх:<br>– перад галоснымі: [б’]іць — [п’]іць, пра[ж]ыць, пра[ш]ыць;<br>– перад санорнымі: [б]руд — [п]руд.<br>• Слабая пазіцыя:<br>– для звонкіх — перад глухімі: нізкі — ні[с]кі;<br>– у канцы слоў: сад — са[т];<br>– для глухіх — перад звонкімі: просьба — про[з’]ба |



© ТДА «Аверсэв»

Па наяўнасці ці адсутнасці змякчэння пры ўтварэнні зычныя гукі падзяляюцца на цвёрдыя і мяккія. Своеасаблівае гучанне, якое ўзнікае, калі сярэдняя частка языка падымаецца да цвёрдага нёба, як пры ўтварэнні гука [й’], называецца мяккасцю.

**ЗЫЧНЫЯ**

**цвёрдыя — 23** | **мяккія — 16**

утвараюць
пары па цвёрдасці — мяккасці:

[б] — [б’], [в] — [в’], [г] — [г’], [ґ] — [ґ’],
[д, дз] — [дз’], [з] — [з’], [к] — [к’],
[л] — [л’], [м] — [м’], [н] — [н’], [п] — [п’],
[с] — [с’], [т] — [ц’], [ф] — [ф’], [х] — [х’].

- Гук [ў] не мае адпаведнага мяккага гука, а гук [й’] не мае парнага цвёрдага гука.
- Гукі [ж], [ш], [дж], [ч], [ц], [р] — зацвярдзелыя і не маюць адпаведных мяккіх гукаў.
- Ад зацвярдзелага [ц] (сэр[ц]а) патрэбна адрозніваць [ц’], які ўтвараецца пры змякчэнні [т]: ха[т]а — у ха[ц’]е, клопа[т] — у клопа[ц’]е.
- Мяккасць зычных абазначаецца на пісьме мяккім знакам і літарамі е, ё, ю, я, і.
- Цвёрдыя і мяккія зычныя могуць адрозніваць словы: [лу]к – [л’у]к

## Чаргаванне гукаў

Чаргаванне гукаў — гэта заканамерная ўзаемазамена гукаў у межах адной і той жа марфемы пры змяненні ці ўтварэнні слоў.

| Чаргаванне гукаў | Пры змяненні слоў | Пры ўтварэнні слоў |
|---|---|---|
| [о] — [а] | г[о]рад — г[а]рады | г[о]рад — г[а]радскі |
| [о] — [ы] | кр[о]ў — кр[ы]ві | кр[о]ў — кр[ы]вавы<br>гр[о]м — гр[ы]мець |
| [э] — [а] | ш[э]сць — ш[а]сці<br>[л’э]с — [л’а]сы | ш[э]сць — ш[а]сцёрка<br>[л’э]с — [л’а]сны |



© ТДА «Аверсэў»

| Чаргаванне гукаў | Пры змяненні слоў | Пры ўтварэнні слоў |
|---|---|---|
| [э] — [о] | | ш[э]сць — ш[о]сты |
| [э] — [а] — [о] | гр[э]бці — гр[а]бу — гр[о]б | гр[э]бці — гр[а]блі |
| [э] — [і] | | ц[в'э]т — ц[в'і]сці |
| [б'] — [бл'] | дра[б']іць — дра[бл']ю | дра[б']іць — дра[бл']енне |
| [в] — [ў] | каро[в]а — каро[ў]ка | сла[в]а — сла[ў]ны |
| [в'] — [ўл'] | ста[в']іць — ста[ўл']ю | ста[в']іць — ста[ўл']енне |
| [м'] — [мл'] | кар[м']іць — кар[мл']ю | кар[м']іць — кар[мл']енне |
| [г] — [з'] | даро[г]а — даро[з']е | |
| [г] — [ж] | | даро[г]а — даро[ж]ны |
| [д] — [дз'] | прыро[д]а — прыро[дз']е | |
| [дз'] — [дж] | ха[дз']іць — ха[дж]у | ха[дз']іць — ха[дж]энне |
| [к] — [ц] | ра[к]а — ра[ц]э | |
| [к] — [ч] | | ра[к]а — ра[ч]ны |
| [т] — [ц'] | свя[т]а — свя[ц']е | свя[т]ло — свя[ц']іць |
| [х] — [с'] | стра[х]а — стра[с']е | |
| [х] — [ш] | | стра[х]а — застрэ[ш]ак |
| [ц'] — [ч] | свя[ц']іць — свя[ч]у | свя[ц']іць — свя[ч]энне |

## Асноўныя фанетычныя законы

Розныя фанетычныя змены падпарадкоўваюцца пэўным правілам, якія выпрацаваны беларускай мовай у працэсе яе фарміравання і развіцця. Гэтыя правілы абавязковыя для ўсіх носьбітаў, і іх прынята называць фанетычнымі законамі.

| Фанетычны закон | Сутнасць фанетычнага закона | Прыклады |
|---|---|---|
| Аканне | Закон пераходу [о], [э] у [а] пасля цвёрдых зычных, калі націск з іх пераходзіць на іншы галосны | ц[э́]ны — ц[а]на, г[о́]рад — г[а]рады́ |



© ТДА «Аверсэв»

| Фанетычны закон | Сутнасць фанетычнага закона | Прыклады |
|---|---|---|
| Яканне | Закон пераходу [о], [э] у [а] пасля мяккіх зычных, калі націск з іх пераходзіць на іншы галосны | [в’о́]сны — [в’а]сна́, [л’э́]с — [л’а]сы́ |
| Дзеканне | Закон пераходу [д] пры яго змякчэнні ў [дз’] | ва[д]а — у ва[дз’]е, [д]ва — [дз’]ве |
| Цеканне | Закон пераходу [т] пры яго змякчэнні ў [ц’] | ха[т]а — у ха[ц’]е |
| Асіміляцыя (прыпадабненне) | Паводле закона асіміляцыі адбываецца:<br>• аглушэнне звонкіх на канцы слоў і ў сярэдзіне слоў перад глухімі;<br>• азванчэнне глухіх перад звонкімі;<br>• прыпадабненне свісцячых да шыпячых;<br>• прыпадабненне шыпячых да свісцячых | сад — са[т], казка — ка[с]ка;<br>просьба — про[з’]ба;<br>разносчык — разно[ш]чык;<br>спяшаешся — спяшае[с’]ся |
| Узнікненне прыстаўных гукаў | Закон узнікнення прыстаўных [і], [а] перад збегам зычных з пачатковымі [л], [р], [м];<br>[в] перад націскнымі пачатковымі гукамі [о́] і [у] | ільняны, іржавы, аржаны, імгла;<br>во́зера, вучань, вучыць |
| Пераход<br>[в] у [ў]<br>[л] у [ў]<br>[у] у [ў] | Закон пераходу:<br>пасля галосных перад зычнымі і ў канцы слова;<br>у канцы слоў у формах дзеясловаў пр. ч. м. р.;<br>пасля галосных | слава — слаўны, з’ява — з’яў;<br>пісала — пісаў;<br>узор — паводле ўзору |



© ТДА «Аверсэв»

# Склад і складападзел

**Склад** — гэта частка слова з аднаго ці некалькіх гукаў, якія вымаўляюцца адным штуршком выдыхаемага паветра.

| Тыпы складоў | Характарыстыка складоў | Прыклады |
|---|---|---|
| адкрыты<br>закрыты<br>непрыкрыты<br>прыкрыты | заканчваецца на галосны гук<br>заканчваецца на зычны гук<br>пачынаецца на галосны гук<br>пачынаецца на зычны гук | да-ро-га, ма-я<br>пар-тфель, квар-тал<br>ад-крыць, а-ул<br>вя-дро, трак-тар |

- У слове столькі складоў, колькі ў ім галосных гукаў: пя-ці-га-до-вы.
- Склад можа ўтварыць адзін галосны гук ці галосны і адзін ці некалькі зычных гукаў, якія прымыкаюць да галоснага: а-э-ра-стат

У складзе гукі звычайна размяшчаюцца ў парадку ўзрастання гучнасці (самыя гучныя гукі галосныя, крыху менш гучныя санорныя, найменш гучныя шумныя). Таму падзел слоў звычайна праводзіцца паміж найбольш і найменш гучнымі гукамі.

| Спалучэнні зычных | Правілы падзелу | Прыклады |
|---|---|---|
| шумны + шумны,<br>шумны + санорны | калі паміж галоснымі спалучэнне шумных ці шумнага і санорнага, то ўсё спалучэнне адносіцца да наступнага склада | ма-чта,<br>ма-стак,<br>ця-пло |
| санорны + шумны | калі паміж галоснымі спалучэнне санорнага і шумнага, то санорны адносіцца да папярэдняга склада, а шумны — да наступнага | план-ка,<br>ан-гі-на,<br>пар-та |
| санорны + санорны | спалучэнне санорных можа падзяляцца, а можа адносіцца да наступнага склада | нор-ма<br>і но-рма,<br>кар-лік<br>і ка-рлік |
| й + зычны<br>ў + зычны | калі паміж галоснымі спалучэнні [й’] і [ў] + зычны, то [й’] і [ў] адносяцца да папярэдняга склада, а зычны — да наступнага | бай-ка,<br>вай-на,<br>воў-на,<br>ваў-кі |



© ТДА «Аверсэв»

# Націск

**Націск** — гэта выдзяленне аднаго са складоў слова шляхам вымаўлення яго з большай сілай голасу і працяглацю.

| Асаблівасці націску | Характарыстыка націску | Прыклады |
|---|---|---|
| Дынамічны (сілавы) | характарызуецца павышанай сілай выдыху склада пры вымаўленні слова | наро́дны, параход́ |
| Свабодны (рознамясцовы) | не мае аднаго месца ў словах, а можа падаць на розныя склады ў розных словах | во́сень, асе́нні, гарадо́к, цывіліза́цыя |
| Рухомы | у розных формах аднаго слова ці ў словах, утвораных ад аднаго кораня, можа пераходзіць з аднаго склада на другі | го́рад, гарады́; зе́лень, зялё́ны, зеляне́ць, зеленава́ты |
| Асноўны (галоўны)<br><br>Пабочны (дадатковы) | націск, які падае на другую частку складаных слоў<br><br>націск, які падае на першую частку складанага слова | высокамаста́цкі, шырокавядо́мы<br><br>ко̀негадо́ўля, до̀брасумле́нны |

- Некаторыя словы маюць варыянтныя націскі, г. зн., што націск у іх можа падаць на розныя склады: віхо́р і ві́хар, веснавы́ і вясно́вы, бу́йны і буйны́.
- Рознамясцовасць і рухомасць націску з'яўляюцца сродкамі адрознення:
  – розных формаў аднаго і таго ж слова: рукі́ (форма Р. скл. адз. л. назоўніка *рука*) і ру́кі (форма Н. скл. мн. л. таго ж назоўніка); высыпа́ць (форма дзеяслова незакончанага трывання) і вы́сыпаць (форма дзеяслова закончанага трывання);
  – розных слоў: каса́ і ка́са, му́ка і мука́, ма́рыць і мары́ць, мазалі́ (назоўнік) і ма́залі (дзеяслоў)



© ТДА «Аверсэв»

# Гукапіс

**Гукапіс** — гэта гукавыя паўторы ў мастацкім маўленні (асабліва ў паэзіі), якія ўзмацняюць мілагучнасць і сэнсавую выразнасць. Асноўныя віды гукавых паўтораў — алітэрацыя і асананс.

| Віды гукапісу | Прыклады | Паўторы гукаў |
|---|---|---|
| **Алітэрацыя** (паўтарэнне аднолькавых ці падобных зычных гукаў) | Дзівосны сон сасонцы сніцца<br>Перад світаннем на зары.<br>У срэбны бубен б'юць сініцы,<br>На флейтах свішчуць снегіры.<br>(В. Вітка). | свісцячыя, санорныя + звонкія [б], [б'] (аднолькавыя ці блізкія па гучнасці) |
| **Асананс** (паўтарэнне аднолькавых ці падобных галосных гукаў) | На тутэйшай зямлі<br>Дзве сястрыцы жылі,<br>Як забытыя ў лесе каліны,<br>Жыватворных крыніц<br>Не было для сястрыц, —<br>Яны вялі і сохлі націнай.<br>(Я. Купала). | [і], [ы] (самыя блізкія па гучанні гукі) |

# Фанетычны разбор

## Парадак разбору

1. Арфаграфічны запіс слова.
2. Склады, націскны склад.
3. Характарыстыка па парадку ўсіх гукаў (галосных — ці націскны; зычных — санорны ці шумны, звонкі ці глухі, цвёрды, мяккі ці зацвярдзелы) і ўказанне, якой літарай яны абазначаны.
4. Колькасць гукаў і літар.

| Узоры разбору | |
|---|---|
| **вусны** | **пісьмовы** |
| Фіялка<br>У слове тры склады: фі-ял-ка, другі склад націскны;<br>фі — прыкрыты, адкрыты;<br>ял — непрыкрыты, закрыты;<br>ка — прыкрыты, адкрыты; | Фіялка;<br>фі-я́л-ка;<br><br>фі — прыкрыты, адкрыты;<br>ял — непрыкрыты, закрыты;<br>ка — прыкрыты, адкрыты; |



© ТДА «Аверсэў»

<table>
<tr><th colspan="2">Узоры разбору</th></tr>
<tr><th>вусны</th><th>пісьмовы</th></tr>
<tr>
<td>гук [ф’] — зычны, шумны, глухі, мяккі, абазначаецца літарай ф (мяккасць абазначана літарай і);<br>[і] — галосны, ненаціскны, абазначаецца літарай і;<br>[й’] — зычны, санорны, мяккі, абазначаецца літарай я;<br>[а] — галосны, націскны, абазначаецца літарай я;<br>[л] — зычны, санорны, цвёрды, абазначаецца літарай л;<br>[к] — зычны, шумны, глухі, цвёрды, абазначаецца літарай к;<br>[а] — галосны, ненацісны, абазначаецца літарай а.<br>У слове фіялка 7 гукаў і 6 літар</td>
<td>гукі — літары<br>[ф’] — зычны, шумны, глухі, мяккі; — ф<br>[і] — галосны, ненаціскны; — і<br>[й’] — зычны, санорны, мяккі; } — я<br>[а] — галосны, націскны; }<br>[л] — зычны, санорны, цвёрды; — л<br>[к] — зычны, шумны, глухі, цвёрды; — к<br>[а] — галосны, ненаціскны — а<br>7 — 6</td>
</tr>
</table>

© ТДА «Аверсэв»

# ГРАФІКА

**Графіка** — раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца пісьмовыя сродкі мовы, суадносіны паміж гукамі і літарамі.
**Літара** — умоўны графічны знак, які служыць для перадачы на пісьме гукаў.
**Алфавіт** — гэта ўсе літары, размешчаныя ў пэўным парадку (інакш — азбука).

## Літары беларускага алфавіта, іх назвы і гукавое значэнне ў слове

| Літары | Іх назвы | Гукавое значэнне ў слове |
|---|---|---|
| Аа *Аа* | а | [а]кно, сор[а]к, рэчк[а] |
| Бб *Бб* | бэ | [б]окс, аз[б]ука, [б’]іч, [б’]ег, ду[п], ры[п]ка |
| Вв *Вв* | вэ | [в]очы, на[в]ука, [в’]ішня, [в’]ясна, сі[в’]ер |
| Гг *Гг* | гэ | [г]умар, ма[г]азін, лу[г’]і, [ґ]онты, [ґ’]ільза |
| Дд *Дд* | дэ | [д]эвіз, [д]рэва, хо[т], пахо[т]ка, а[ч]чай, на ло[ц]цы |
| Ее *Ее* | е | [м’э]даль, [с’э]м, [й’э]лка, з’[й’э]ў, ба[й’э]ц, каль[й’э] |
| Ёё *Ёё* | ё | [в’о]сны, [й’о]рш, ма[й’о]р, кампань[й’о]н, аб’[й’о]м |
| Жж *Жж* | жэ | [ж]уравель, лы[ж]ы, ву[ш], ду[ш]ка |
| Зз *Зз* | зэ | [з]амак, ма[з]оль, [з’]іма, параво[с] |
| Іі *Іі* | і | [б’і]лет, [і]дылія, [й’і]скра, маза[й’і]ка, пед[ы]нстытут |
| Йй *Йй* | і нескладовае | ма[й’], ма[й’]скі, ба[й’]ка |
| Кк *Кк* | ка | [к]ара, па[к]лон, ва[к]цына, сма[к], [к’]ісель, [к’]ювет, ва[ґ]зал |
| Лл *Лл* | эл | [л]учына, бу[л]ка, кана[л], [л’]ес, до[л’]ька |
| Мм *Мм* | эм | [м]ыш, ба[м]бук, со[м], ка[м’]ета |
| Нн *Нн* | эн | [н]ага, ка[н]ал, бара[н], [н’]іва, ма[н’]ера |



© ТДА «Аверсэв»

| Літары | Іх назвы | Гукавое значэнне ў слове |
|---|---|---|
| Оо *Оо* | о | [о]канне, вак[о]л |
| Пп *Пп* | пэ | [п]арад, на[п]рава, хло[п]чык, сно[п], [п']ірат |
| Рр *Рр* | эр | [р]ама, буква[р], ва[р]ыць |
| Сс *Сс* | эс | [с]он, па[с]лаць, авё[с], [с']ёлы, [с']мех, пі[с']мо, кара[с'], [ш]шытак |
| Тт *Тт* | тэ | [т]рава, ху[т]ка, маршру[т], фу[д]бол, у вопра[ц]цы |
| Уу *Уу* | у | [у]ваход, аквары[у]м, в[у]чань |
| Ўў *Ўў* | у нескладовае | сла[ў]ны, жора[ў], спява[ў] |
| Фф *Фф* | эф | [ф]антан, [ф']іранка |
| Хх *Хх* | ха | [х]ата, му[х]а, [х']ітры |
| Цц *Цц* | цэ | [ц]ана, мо[ц]ны, [ц']ясляр, [ц']вік, ба[ц']ка, пла[дз]дарм |
| Чч *Чч* | чэ | [ч]ай, да[ч]ка, но[ч], лі[дж]ба, па клада[ц]цы |
| Шш *Шш* | ша | [ш]а[ш]ка, [ш]ала[ш], латы[с]кі |
| ы *ы* | ы | ч[ы]ж[ы]к, шар[ы]к |
| ь *ь* | мяккі знак | абазначае мяккасць папярэдняга зычнага: касьба, ліпень, медальён |
| Ээ *Ээ* | э | [э]поха, р[э]ха, р[э]форма |
| Юю *Юю* | ю | [л'у]дзі, прэ[л'у]дыя, [й'у]нак, сям'[й'у] |
| Яя *Яя* | я | [з'а]м[л'а], [й'а]шчарка, сва[й'а]к, міль[й'а]рд |

- У беларускім алфавіце 10 літар для абазначэння галосных гукаў і 21 літара для абазначэння зычных гукаў.
- Літара ь (мяккі знак) гука не абазначае, яна ўжываецца для абазначэння мяккасці папярэдняга гука.
- Гукі [дж], [дз], [дз'] абазначаюцца на пісьме спалучэннямі дзвюх літар д і ж, д і з (таму дж, дз называюцца дыграфамі).
  Дыграф дж можа абазначаць таксама гук [ч], а дыграф дз — гук [ц']: дождж [дошч], дзядзька [дз'ац'ка].
- Апостраф (') літарай не з'яўляецца і ў алфавіт не ўключаецца



© ТДА «Аверсэв»

# АРФАЭПІЯ

**Арфаэпія** — раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца агульнапрынятыя правілы вымаўлення гукаў і іх спалучэнняў.

## Вымаўленне галосных гукаў

Вымаўленне галосных гукаў залежыць ад націску і суседніх гукаў.

| Гукі | Становішча гукаў | Правілы вымаўлення |
|---|---|---|
| усе галосныя | пад націскам | вымаўляюцца выразна: душ[а], в[о]чы, ц[э]гла, мал[і]на, в[у]чань, вуч[ы]ць |
| [о], [э] | не пад націскам:<br>а) пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных; | як [а]: в[а]чэй, ц[а]гляны (аканне);<br>як [ы] у некаторых словах: кр[о]ў — кр[ы]ві, хр[э]ст — хр[ы]сціць;<br>**але:** інж[ы]нер, др[ы]зіна, р[ы]сора, канц[ы]лярыя, р[э]корд, т[э]арэма } і іншыя запазычаныя |
| | б) пасля мяккіх зычных у першым складзе перад націскам | як [а]: [в’о]ска — [в’а]ско́вы, [м’э]сца — [м’а]сцо́вы, [с’а]ржа́нт, ка[л’а]нда́р, [дз’а]вя́ты, [дз’а]ся́ты, [с’а]мна́ццаць, ва[с’а]мна́ццаць } яканне<br>**але:** семсо́т, восемсо́т; геро́й, медаль, берэт (і іншыя запазычаныя) |
| [ы] | не пад націскам | выразна: в[ы]ш[ы]ня |
| [і] | а) у пачатку слова, сярэдзіне пасля галоснага, пасля гука [ў], мяккага знака і апострафа; | як [й’і] → іней — [й’і]ней; краіна — кра[й’і]на; салаўі — салаў[й’і]; аб’інелы — аб’[й’і]нелы; Ільіч — Іль[й’і]ч |



© ТДА «Аверсэв»

| Гукі | Становішча гукаў | Правілы вымаўлення |
|---|---|---|
| | б) пасля цвёрдых (апрача [г], [к], [х]) на стыку прыстаўкі і кораня, частак складаных слоў або двух слоў; | як [ы] → ад[ы]менны, пед[ы]нстытут, сын [ы] бацька |
| | в) пасля галоснага папярэдняга слова | як [й’] ці [й’і] → бацька [й’] сын, да [й’]вана, да [й’і]вана<br>**але** пры запаволеным маўленні вымаўляецца [і]: бацька [і] сын, да [і]вана |
| [у] | пачатковы [у] пасля слова на галосны | як [ў]: былі [ў]сюды, да [ў]ладзіміра |

**!** Часціца не і прыназоўнік без перад словам з націскам на першым складзе вымаўляюцца з гукам [а]: [н’а] ве́льмі, [б’аз] ве́стак

## Вымаўленне зычных гукаў

Вымаўленне зычных гукаў залежыць ад пазіцыі ў слове.

| Гукі | Пазіцыя | Правілы вымаўлення |
|---|---|---|
| звонкія зычныя | на канцы слоў; у сярэдзіне слоў перад глухімі | як глухія: хле[п], лу[х], са[т], гры[п]кі, пахо[т]ка |
| глухія зычныя | у сярэдзіне слоў перад звонкімі | як звонкія: касьба – ка[з’]ба, просьба – про[з’]ба |
| свісцячыя | перад шыпячымі | як шыпячыя: [ш]шытак, перапі[ш]чык |



© ТДА «Аверсэв»

| Гукі | Пазіцыя | Правілы вымаўлення |
|---|---|---|
| шыпячыя | перад свісцячымі | як свісцячыя: на рэ[ц]цы, на до[с]цы |
| [з], [с] | перад мяккімі (акрамя [г'], [к'], [х']) | як мяккія: [з']мена, [з']езд, [с']мех; **але:** [з]гінуць, [с]кінуць, [с]хіліць |
| [д], [т] | перад мяккім [в'] | як [дз']: [дз']веры, по[дз']віг; [ц']: Ма[ц']вей, ба[ц']вінне; **але:** – у прыстаўках: [ад]вязаць; – у формах Д. і М. скл. назоўнікаў на -тве: у Лі[т]ве, кля[т]ве, бры[т]ве, дра[т]ве, у таварыс[т]ве |
| [г] | не на канцы слова і не перад глухімі | працяжна (г фрыкатыўны): [г]утарка, ма[г]утны |
| [ґ] | у асобных запазычаных словах | як выбухны: [ґ]онты, [ґ]анак, [ґ]узік |
| [р], [ч] | у розных пазіцыях | як цвёрдыя (заўсёды): бя[р]оза, бе[р]аг, [ч]ыгун, [ч]ужы, пе[ч] |
| [б], [п], [м], [ф] | перад мяккімі і на канцы слоў | не змякчаюцца: гра[б]лі, сы[п]ні, сы[п], се[м], вер[ф], су[ф]лёр |

## Вымаўленне спалучэнняў зычных

| Спалучэнні літар | Вымаўленне | Прыклады |
|---|---|---|
| дск | [цк] | грамадскі — грама[цк']і, суседскі — сусе[цк']і |
| дств | [цтв] | грамадства — грама[цтв]а, суседства — сусе[цтв]а |



© ТДА «Аверсэв»

| Спалучэнні літар | Вымаўленне | Прыклады |
|---|---|---|
| дц | [цц]<br>[ц’ц’] | адцурацца — а[цц]урацца,<br>адцвітаць — а[ц’ц’]вітаць |
| дч | [чч] | выкладчык — выкла[чч]ык |
| ждж | [шч]<br>[ж͡дж] | дождж — до[шч]<br>дажджы — да[ж͡дж]ы, да[ж͡дж]авы |
| жск | [ск’] | нясвіжскі — нясві[ск’]і |
| здк | [стк] | паездка — пае[стк]а |
| здж | [ж͡дж] | заезджы — зае[ж͡дж]ы |
| зск | [ск’] | сілезскі — сіле[сск’]і |
| тч | [чч] | пераплётчык — пераплё[чч]ык |
| шск | [ск’] | латышскі — латы[ск’]і |
| чн | [чн]<br><br>[чн’] і [шн’] | смачны — сма[чн]ы,<br>канечны — кане[чн]ы,<br>яечня — яе[чн’]я і яе[шн’]я |

© ТДА «Аверсэв»

## 10. Правапіс ДЗ, Ц і Д, Т

| | |
|---|---|
| **ДЗ, Ц** | • перад **е, ё, ю, я, і, ь:** ідзеш (іду), цёхкаць (цокаць), дзюба (дуба), выцякаць (выток), дзікі, дзядзька;<br>• перад **[в’], [м’]:** два — дзве, батва — бацвінне, цьмяны;<br>• у словах: дзверы, цвілы, яцвяг, ліцвін і інш.; **але:** твіст;<br>• перад суфіксамі **-ін-, -ір, -ік, -ёр, -еец, -ейск-:** плаціна, мундзір, рулецік, манцёр, індзеец, індзейскі |
| **Д, Т** | • пераважна ў іншамоўных словах: дэлегат, тэхніка, матэрыя, кандыдат, дысцыпліна, тырада, атэстат; **але:** дзюна, цюль, уверцюра, дзюшэс, нацюрморт;<br>• прыставачны **[д]** і суфіксальны **[т]** перад **[в’]** не пераходзяць у **дз, ц:** надводзіць — надвяду, сялянства — сялянстве;<br>• у аддзеяслоўных назоўніках і вытворных ад іх: брыць — брытва, брытве, брытвенны; біць — бітва, бітве |

Ва ўласных іншамоўных назвах дз, ц, ці д, т пішуцца ў адпаведнасці з вымаўленнем: Авідзій, Барадзіно, Цюрынгія, Куцюр’е, Вучэціч, Адэлаіда, Адыс-Абеба, Тэвасян, Тэкерэй, Тыбет

## 11. Правапіс падоўжаных зычных

Падоўжанымі называюцца зычныя, якія знаходзяцца паміж галоснымі, вымаўляюцца працяжна і адносяцца да адной марфемы — кораня. Яны ўзніклі ў выніку страты ь і прыпадабнення й да папярэдняга зычнага: насе[ньй’]е → насе[н’й’]е → насе[н’н’]е → насенне.
У беларускай мове 9 падоўжаных зычных, якія на пісьме перадаюцца дзвюма адпаведнымі літарамі.



© ТДА «Аверсэв»

| Падвоеныя літары | |
|---|---|
| **пішуцца** | **не пішуцца** |
| у спрадвечна беларускіх словах: падарожжа, суддзя, палоззе, калоссе, Залессе, ралля, натхненне, мыццё, бездарожжа, сучча, застрэшша; Аксіння; **але:** Ілья, Касьян, Ульяна, Юльян, вытворныя ад іх і ад слова ліць: лью, палью, пальеі інш. | у іншамоўных словах: маса, калекцыя, тона, акамадацыя, імунітэт, тэрыторыя; Ала, Эма, Васа, Джэма, Нона; **але:** ванна, бонна, донна, манна, мецца-сапрана, панна; Ганна, Жанна, Мадонна, Сюзанна |

## 12. Правапіс спалучэнняў зычных

У беларускай мове старажытныя спалучэнні зычных здн, рдц, рдн, стн, стл, лнц спрасціліся, таму ў сучаснай мове ў іх не пішуцца літары д, т, л.

| Спрашчэнне спалучэнняў | Прыклады |
|---|---|
| здн → зн | прыязны, выязны |
| рдц → рц | сэрца, сэрцайка |
| рдн → рн | міласэрны, міласэрнасць |
| стл → сл | усланы, шчаслівы |
| стн → сн | вусны, бязлітасны, аванпосны, баласны (і баластавы), кантрасны, кампосны, фарпосны |
| лнц → нц | сонца |
| дт → т | Гумбальт, Кранштат, Шміт |

## Напісанні, заснаваныя на марфалагічным прынцыпе

| звонкія зычныя | | глухія зычныя | свісцячыя | шыпячыя | дц, тц, дч, тч |
|---|---|---|---|---|---|
| на канцы слова: дуб [дуп] | у сярэдзіне слова: дубкі [дупкі] | перад звонкімі: просьба [проз'ба] | перад шыпячымі: сшытак [шшытак] | перад свісцячымі: спяшаешся [с'п'ашай'э-с'с'я] | наградцы, цётцы, наладчык, лётчык |



© ТДА «Аверсэв»

| з, ж, ш, г, к + ск | мяккія зычныя | б, д у прыстаўках | д + ск | словы без, не |
|---|---|---|---|---|
| каўказскі, суражскі, чэшскі, выбаргскі | перад мяккімі: змена [з’м’эна], снег [с’н’эх] | абсушыць [апсушыц’], падсушыць [патсушыц’] | гарадскі [гарацк’і], лідскі [ліцк’і] | без кнігі — [б’ас] кнігі, не ведаў — [н’а] ведаў |

## Правапіс змякчальнага мяккага знака

| Пасля мяккіх зычных з, л, н, с, ц, дз | |
|---|---|
| **мяккі знак пішацца** | **мяккі знак не пішацца** |
| • на канцы слоў: мазь, нуль, алень;<br>• у сярэдзіне перад цвёрдымі зычнымі, калі мяккасць захоўваецца і перад мяккімі: пісьмо — на пісьме, вазьму — возьме, восьмы — васьмю;<br>• перад канчаткам **-мі** ў назоўніках творнага склону адзіночнага ліку: дзецьмі, коньмі;<br>• перад **-чык**, калі слова без **-чык** мае на канцы мяккі знак: агеньчык (агонь);<br>• перад **-ск-** у прыметніках, утвораных ад назваў месяцаў на **-нь** і слова *восень*: студзеньскі, восеньскі;<br>• у **-еньк-**, **-эньк-**, **-аньк-**: беленькі, даражэнькі, шэранькі;<br>• у складаных лічэбніках: пяцьдзясят, шэсцьсот;<br>• у постфіксе **-сьці**: чагосьці;<br>• перад **-це**, **-ся**, **-ма** ў дзеясловах загаднага ладу: сядзьце, застанься, кіньма;<br>• у слове ледзьве | • паміж падоўжанымі зычнымі: сумленне, ралля, калоссе;<br>• у слове *ззяць*;<br>• пасля **з, с, ц, дз** перад мяккімі, калі пры змене слова абодва зычныя застаюцца мяккімі: песня — песні, звер — зверам, звяры;<br>**але:** носьбіт;<br>• перад **-ск-** у словах, утвораных ад назоўнікаў на **-нь** (але не ад назваў месяцаў на **-нь**): конскі (конь), хатынскі (Хатынь), цянь-шанскі (Цянь-Шань) |



© ТДА «Аверсэв»

# Правапіс раздзяляльнага мяккага знака і апострафа

**Перад е, ё, ю, я, націскным і**

| мяккі знак | апостраф |
|---|---|
| • у іншамоўных словах: рэльеф, каньён, Кавеньяк, Льюіс, віньетка;<br>• у імёнах, прозвішчах, геаграфічных назвах перад -еў-: Аркадзьеў, Васільеўка, Лявонцьеў;<br>• пасля г, к, х і збегу зычных, акрамя нц, перад -еў- (-ев-) пішацца і(ы): Георгіеў, Яўціхіеў, Дзмітрыеў, Ануфрыевіч | • пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных: аб'езд, пад'ём, куп'ё, Барб'е, вераб'іны;<br>**але:** прыслоўе, салаўі, шчаўе, Іўе;<br>• у складаных словах пасля частак двух-, трох-, чатырох-, шмат-: трох'ярусны, шмат'якарны<br>Заўвага. Апостраф не пішацца пасля ў: абаўе, салаўі. |

# Правапіс вялікай літары

| З вялікай літары пішуцца | Прыклады |
|---|---|
| 1. Імёны, імёны па бацьку, прозвішчы, псеўданімы, мянушкі людзей, клічкі жывёл; міфалагічныя істоты; дзеючыя асобы ў казках і байках; назвы бостваў | Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч (Якуб Колас); Хітры, Жмінда; Шарык, Лыска; Венера, Зеўс, Пярун; Сава, Асёл, Сонца, Дуб, Бог, Алах, Госпад, Уладыка Нябесны, Божы, Біблія, Дзед Мароз, Баба Яга |
| 2. Геаграфічныя і астранамічныя назвы, назвы дзяржаў і іх частак, частак свету, адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, вуліц, плошчаў<br>! У састаўных назвах словы з родавым значэннем пішуцца з малой літары | Аўстралія, Нептун, Беларусь, Расійская Федэрацыя, Далёкі Усход, Полаччына, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Эльбрус, Свіцязь, плошча Свабоды, праспект Незалежнасці, Паўночны Ледавіты акіян, возера Свіцязь, мыс Добрай Надзеі, камета Галея |



© ТДА «Аверсэв»

| З вялікай літары пішуцца | Прыклады |
|---|---|
| 3. Першае слова ў большасці назваў гістарычных падзей, эпох, з'яў, гістарычных дакументаў, твораў літаратуры і мастацтва, свят, знамянальных дат, міністэрстваў, устаноў і арганізацый, вышэйшых навучальных устаноў, палітычных партый, кангрэсаў, з'ездаў і ўсе ўласныя імёны, якія ўваходзяць у склад такіх назваў | Версальскі мір, Парыжская камуна, Напалеонаўскія войны, Літоўская метрыка, Новы год, Вялікдзень, Другая сусветная вайна, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны, Міжнародны кангрэс беларусістаў, Аб'яднаная грамадзянская партыя, раман «Каласы пад сярпом тваім», фабрыка «Камунарка», выдавецтва «Народная асвета»;<br>**але:** Вялікая Айчынная вайна, Дзень Перамогі, дапятроўская эпоха, антычны свет |
| 4. Кожнае слова ў назвах вышэйшых дзяржаўных устаноў, пасад, некаторых міжнародных арганізацый, акрамя службовых слоў і слоў з родавым значэннем | Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Генеральная Асамблея Арганізацыі Аб'яднаных Нацый |
| 5. Прыметнікі, утвораныя ад уласных назваў, калі яны:<br>• указваюць на прыналежнасць;<br>• уваходзяць у склад назваў, роўных па значэнні назвам са словамі *імя*, *памяці* | Алесіна лялька, Антосева хата; Купалаўская прэмія (прэмія імя Янкі Купалы), Нобелеўская прэмія міру;<br>**але:** ахілесава пята, піфагорава тэарэма, праметэеў агонь, коласаўскі стыль, эзопаўская мова, сувораўская тактыка |
| 6. Усе словы ў назвах ордэнаў (акрамя слоў *ордэн*, *ступень*), калі яны не бяруцца ў двукоссе | ордэн Айчыннай Вайны I ступені, ордэн Славы II ступені, ордэн Францыска Скарыны, ордэн Маці, ордэн Пашаны |



© ТДА «Аверсэв»

| З вялікай літары пішуцца | Прыклады |
| --- | --- |
| 7. У назвах узнагарод, якія бяруцца ў двукоссе, з вялікай літары пішацца першае слова і ўласныя назвы | медаль «За ўзяцце Берліна», знак «Выдатнік народнай асветы»; **але:** медаль «Залатая Зорка» |
| 8. Лічэбнікі пры ўласных імёнах | Пётр Першы, кароль Альберт Другі |
| 9. Назвы кандытарскіх і парфумерных вырабаў, марак прамысловых вырабаў, якія пры гэтым бяруцца ў двукоссе | цукеркі «Беларускія», мыла «Дэльфін», пудра «Ліра», набор «Жадаю шчасця», трактар «Беларус», веласіпед «Школьнік» |

© ТДА «Аверсэв»